# Паўстанне кліча ў бібліятэку

Сёлета ў студзені спаўняецца 130 гадоў з пачатку паўстання 1863—1864 гг. Гэта адна з найбольш значных падзей XIX стагоддзя на Беларусі. Лёс, які выбралі сабе яе героі, вядомыя і менш вядомыя, высокі прыклад іх ахвярнага служэння народу, ідэі вольнасці Айчыны хвалявалі і будуць хваляваць нас. У серыі артыкулаў на працягу года мы мяркуем прайсці па слядах паўстання і паўстанцаў. Сёння ж хочам адрасаваць зацікаўленых чытачоў да аднаго не так шырока вядомага, але карыснага і змястоўнага выдання, якое канцэнтруе на сённяшні дзень амаль усю інфармацыю аб тых падзеях.

Памятнай даце прысвечаны спецыяльны выпуск бюлетэня «Новыя кнігі Беларусі», які выдаецца Нацыянальнай бібліятэкай. У пятым нумары бюлетэня за 1992 год змешчаны бібліяграфічны спіс «Паўстанне 1863—1864 гг. на Беларусі». Тут вы знойдзеце інфармацыю пра гістарычныя даследаванні (іх змест раскрываецца ў анатацыях) і літаратурныя творы, у якіх прыведзены цікавыя звесткі, факты, статыстычныя даныя з архіўных дакументаў, а таксама ўспаміны сведак і ўдзельнікаў тых падзей.

Першы раздзел «З летапісу паўстання» пазнаёміць з матэрыяламі, што даюць магчымасць атрымаць агульнае ўяўленне аб перадумовах, рухаючых сілах, праграме, тактыцы кіраўніцтва, і прычынах паражэння паўстання. Сярод іх дааваенныя выданні прац гісторыкаў У. Ігнатоўскага, С. Цытовіча і публікацыі дакументаў з савецкіх і польскіх архіваў у шматтомнай серыі «Восстание 1863 г. Документы и материалы», пачатай у 1957 г. У наступным раздзеле «Постаці ўдзельнікаў паўстання» асаблівая ўвага ўдзелена літаратуры пра яго кіраўніка Кастуся Каліноўскага, асоба якога і па сённяшні дзень выклікае гарачыя спрэчкі. Таксама прадстаўлены матэрыялы, якія асвятляюць старонкі жыцця паплечнікаў К. Каліноўскага, удзел у тых падзеях беларускай інтэлігенцыі.

Да паўстання 1863—1864 гг. і, галоўным чынам, да вобраза К. Каліноўскага звярталіся і пастаянна звяртаюцца ў сваёй творчасці многія пісьменнікі і дзеячы мастацтва. Гэтыя творы сабраны ў асобны раздзел — «Паўстанне і К. Каліноўскі ў літаратуры і мастацтве». Сярод іх пачэснае месца адведзена напісанаму У. С. Караткевічам.

Бюлетэнь можна атрымаць у любой публічнай бібліятэцы рэспублікі або набыць яго ў кніжным кіёску па продажы літаратуры, які размешчаны ў фае Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

**Наталля БЯГУН,**
**бібліёграф.**